С.А. Пацыенка

# ЭВАЛЮЦЫЯ ЗАМКАВЫХ ПАБУДОЎ У ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ



Першапачаткова замкі ўзніклі як магутныя абарончыя пункты. Развіццё фартыфікацыйнаінжынернай думкі прывяло да таго, што ў канцы IX – пачатку X ст. у Еўропе пачалося будаўніцтва мураваных замкаў. З'яўленне першых мураваных абарончых пабудоў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага даследчыкі адносяць да другой паловы XIII ст. Натуральна, што іх узнікненне было падрыхтавана фартыфікацыйнымі дасягненнямі папярэдніх часоў, бо будаўніцтва разнастайных земляных і драўлянамураваных умацаванняў, такіх, як валы і равы, астрогі, парканы, гародні і інш., вялося і раней.

Стварэння надзейных пунктаў абароны вымагала геапалітычнае размяшчэнне земляў Вялікага княства Літоўскага. Каб не стаць лёгкай здабычай для татар, крыжакоў і іншага ворага, трэба было выкарыстоўваць самыя апошнія дасягненні ваеннаінжынернай справы. Суседства з еўрапейскімі краінамі аказала значны ўплыў на развіццё абарончага дойлідства ў Вялікім княстве Літоўскім, што праявілася ў распаўсюджанні раманскага і гатычнага стыляў у архітэктуры гэтага рэгіёна.

Узровень тагачаснай ваеннай навукі дазваляў лічыць магутную мураваную пабудову дастаткова эфектыўным сродкам абароны ад варожых нашэсцяў. Да часоў распаўсюджання пораху і з'яўлення артылерыі асноўнымі відамі атакі замкаў былі аблога і штурм. Падчас аблогі нападаўшыя пераразалі шляхі забеспячэння замка ежай і чакалі, калі знясіленыя абаронцы здадуцца на міласць

пераможцы. Нярэдка аблогі суправаджаліся падкопамі і стральбой з трэбушэтаў. Наступным крокам у стратэгіі і тактыцы ваенных дзеянняў стала замена “тактыкі пасіўнай аблогі актыўным штурмам з дапамогай новай ваеннай тэхнікі – камнямётных машынпарокаў” [7, *9*].



Даволі падрабязнае апісанне шматлікіх аблог прыведзена ў “Хроніцы Лівоніі” (1224–1227) Генрыха Латвійскага. Напрыклад, вось як пачыналася аблога замка Мезіётэ аб’яднаным войскам тэўтонцаў, ліваў і лэтаў у лютым 1220 г.: “Адны пабудавалі асадную вежу, другія ўстанавілі сценабітныя машыны, трэція дзейнічалі балістамі, чацвёртыя зрабілі вожыка (разнавіднасць асаднай машыны. – *С.П.*) і сталі знізу падрываць вал, пятыя запаўнялі роў, зносячы туды бярвенне, паверх якога паставілі асадную вежу, а ўнізе вялі падкоп…” [3, *189*]. Як бачым, існаваў значны арсенал прыладаў і прыёмаў аблогі, таму пры будаўніцтве замкаў выкарыстоўваліся ўсе магчымыя сродкі абароны.

Першымі самастойнымі муравaнымі пабудовамі, якія з’явіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі, сталі магутныя вежыданжоны. Распаўсюджанне гэтага тыпу ішло з Заходняй Еўропы (назва паходзіць ад французскага donjon – замкавая вежа). Данжон уяўляў сабой шмат’ярусную вежу, абкружаную магутнымі сценамі. Адзначым, што ў выкарыстанні дадатковых умацаванняў вакол яго праявіўся прынцып паэтапных ліній абароны, характэрны для

абарончага дойлідства ў цэлым. Данжон выконваў адразу некалькі функцый: абарончую (назіральны пункт, самастойны рубеж абароны), жыллёвую (размяшчэнне жылых памяшканняў), гаспадарчую (склад разнастайных запасаў і ваеннага рыштунку). Камянецкая вежа – яскравы ўзор данжона на нашых землях была ўзведзена паміж 1276 і 1288 гг. Паступова будаўніцтва вежаўданжонаў распаўсюдзілася па ўсёй тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага: яны былі пабудаваны ў Брэсце, Гродне, Навагрудку, Тураве, Полацку і інш.



Наступным этапам развіцця абарончага дойлідства ў Вялікім княстве Літоўскім стала з'яўленне замкаў тыпу "кастэль" (ад лацінскага castellum). Яны ўяўлялі сабой замкнёныя 4вугольныя збудаванні з магутнымі сценамі і адной ці дзвюма мураванымі вежамі ў процілеглых вуглах. На ўнутраных пляцоўках узводзіліся разнастайныя драўляныя збудаванні ваеннага, жылога і гаспадарчага прызначэння, выкопваліся студні. Такія замкі былі вядомы ў Германіі, Даніі, на поўдні Скандынавіі з XII ст. Тып "кастэлі" актыўна выкарыстоўваўся крыжакамі і лівонскімі рыцарамі. У першай палове XIV ст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ўзніклі Лідскі, Крэўскі і Медніцкі замкікастэлі. Узводзіліся яны сярод балот на невялікіх пясчаных выспах. З найбольш небяспечных бакоў дадаткова выкопваліся равы.

Акрамя вышэйадзначаных у Вялікім княстве Літоўскім будаваліся разнастайныя па абрысах мураваныя замкі, якія размяшчаліся на ўзвышшах (Навагрудскі, Гродзенскі Стары). Часцей за ўсё планіроўка такіх пабудоў – некалькі вежаў, злучаных паміж сабой сценамі, – паўтарала канфігурацыю рэльефу.



Абарончае дойлідства вельмі чуйна рэагавала на пастаяннае ўдасканаленне зброі. З’яўленне ў сярэдзіне XV ст. у Еўропе асаднай артылерыі выклікала канструкцыйнапланіровачныя змены ў замкавым будаўніцтве, што праявілася ў пераносе асноўнай агнявой нагрузкі на знешнія ўмацаванні – валы і равы. Пераходным этапам у працэсе пераносу асноўнага цяжару абароны з вежаў на бастыёны стала будаўніцтва замкаў з бастэйнай фартыфікацыяй. Бастэі – земляныя насыпы або 2ярусныя мураваныя збудаванні круглай ці падкovападобнай у плане формы – выступалі за лінію замкавых сцен і фланкіравалі падыходы да іх. Да гэтага тыпу можна аднесці пабудаваны ў канцы XV – XVI ст. замак у Геранёнах.

Апагеем развіцця абарончага дойлідства сталі замкі з бастыённымі ўмацаваннямі. У канцы XV ст. італьянскія ваенныя інжынеры вынайшлі бастыённую фартыфікацыйную сістэму, з’яўленне якой М.А. Ткачоў назваў “сапраўднай рэвалюцыяй” [7, 51]. Яе прынцып заключаўся ў абнясенні на даволі вялікай адлегласці замкавага будынка курцінамі – валамі з бастыёнамі (ад познелацінскага bastillio – будую ўмацаванне) – пяцівугольнымі ўмацаваннямі па вуглах для абстрэлу мясцовасці перад валамі і равамі. Пры гэтым земляныя валы ўмацаванняў на значную вышыню абмуроўваліся каменем. Пазнейшыя ўдасканаленні еўрапейскіх майстроў замянілі каменную муроўку землянымі ўмацаваннямі. У XVI–XVII стст. у Вялікім княстве Літоўскім быў узведзены шэраг замкаў з бастыённай сістэмай умацаванняў: Заслаўскі, Нясвіжскі, Быхаўскі і інш.



Прыкладна з XVI ст. на замкавых дварах пачынаюць будавацца асобныя карпусы для прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя – палацы. На тэрыторыі Навагрудскага замка вялікакняжацкі палац размяшчаўся паміж вежамі Шчытоўка і Касцельная (дакладны час яго пабудовы невядомы, але ў канцы XVI ці пачатку XVII ст. да яго ўжо рабіліся прыбудовы). Палац у Мірскім замку ўзнік у першым дзесяцігоддзі – другой палове XVI ст. У 1580 г. у Гродзенскім замку ўзвялі палац Стэфана Баторыя. У канцы XVI ст. быў пабудаваны палац у Геранёнскім замку і інш. Так што з канца XVI ст. замкавае будаўніцтва паступова трансфармуецца ў палацавазамкавае.

Паступова задачы абароны саступалі месца рэпрэзентатыўнай значнасці, і ўжо ў XVII ст. некаторыя замкі пачалі абкружацца штучна створаным ландшафтам – паркамі, "італьянскімі садамі", вадаёмамі і іншымі формамі ландшафтнага дызайну. У XVIII ст. гэтая тэндэнцыя яшчэ больш сцвердзілася на землях Вялікага княства Літоўскага і прывяла да ўзнікнення новага тыпу палацавапаркавага ансамбля. Ён значна адрозніваўся ад папярэдніх замкавых пабудоў і ўяўляў сабой адкрытую кампазіцыю, неад'емным элементам якой выступала навакольная прырода. Будынак палаца размяшчаўся паміж парадным дваром і вялікім паркам. Такім чынам, на працягу XVIII ст. са з'яўленнем палацаў у Вялікім княстве Літоўскім спынілася ўласна замкавае будаўніцтва.



У працэсе развіцця замкавай архітэктуры адбыўся паступовы пераход ад будаўніцтва ваенных пунктаў да стварэння рэзідэнцый. Для гэтага мелася некалькі прычын. Паколькі самай галоўнай задачай першых замкаў была абарона, пры будаўніцтве ёй надавалася асноўная ўвага. Жылыя часткі адрозніваліся невялікімі памерамі і нязручнасцю. У XIV – пачатку XV ст. у Вялікім княстве Літоўскім значна ўзрасла інтэнсіўнасць жыцця ў замках, у выніку ўзнікла патрэбнасць у павелічэнні жылых плошчаў.

Аднак у найбольшай ступені развіццё абарончага дойлідства залежала ад палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў Вялікім княстве Літоўскім. Умовы XIII–XV стст. былі такія, што ініцыятарам замкавага будаўніцтва ў гэты перыяд выступала дзяржава. Папершае, замкі з’яўляліся важнымі стратэгічнымі пунктамі агульнадзяржаўнага ўзроўню. Падругое, утрыманне вялікай замкавай гаспадаркі патрабавала значных выдаткаў. З перамогай у Грунвальдскай бітве (1410 г.) для краіны на некаторы час знікла непасрэдная ваенная пагроза, што дало гарадам магчымасць свабодна развівацца. Гэта ў сваю чаргу паспрыяла ўзмацненню эканамічнага становішча магнатаў. У выніку дзяржаўныя замкі пачалі губляць значэнне моцных абарончых пунктаў і прыходзіць у заняпад.



З гэтага часу пачынаецца актыўнае будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў – прадстаўнічых рэзідэнцый феадалаў. Галоўнымі патрабаваннямі заможных магнатаў сталі камфорт і рэпрэзентатыўнасць, знешняе ўвасабленне якіх прынесла эстэтыка новай эпохі Адраджэння. Змены ў аб'ёмнапланіровачнай структуры замкаў і асабліва перанос у далейшым абарончай нагрузкі на знешнія ўмацаванні прывялі да павелічэння замкавай тэрыторыі і пазбавілі жылыя карпусы выразных рысаў абарончых пабудоў.

У працэсе даследавання архітэктурных формаў абарончага дойлідства Вялікага княства Літоўскага мы звярнулі ўвагу на наступную акалічнасць. У сучаснага чалавека складваецца ўражанне, што наяўнасць цыліндрычных вежаў з'яўляецца зусім нехарактэрнай рысай для беларускага замкавага будаўніцтва (за выключэннем Камянецкай вежы). Усе вежы тых нешматлікіх замкаў, якія дайшлі да нашых часоў, – вежы кубічнай, прызматычнай ці іншай формы. Тым не менш даследаванні археолагаў сведчаць, што на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага існавалі мураваныя замкі, якія мелі цыліндрычныя вежы. Так, аснову Гродзенскага замка Вітаўта ў канцы XIV–XV ст. складаў "двухпавярховы палац з мураванымі контрфорсамі, стромкім, ламанай канфігурацыі дахам і круглай трох'яруснай вежай, завершанай зубцамі і высокім, канічнай формы дахам" [2, *115*]. Мядзельскі замак (XV–XVI стст.) меў тры цыліндрычныя вежы, дыяметр самай вялікай з якіх – 17,5 м пры таўшчыні сцен 3,5 м [1, *81*]. У канцы XV–XVI ст. у Геранёнах быў узведзены замак, па вуглах якога стаялі "цыліндрычныя вежы дыяметрам 8 м, пабудаваныя ў тэхніцы "лусковай" муроўкі" [4, *144*].



Звернемся да гісторыі будаўніцтва замкаў на тэрыторыі Еўропы. Традыцыю будаўніцтва цыліндрычных вежаў у XII–XIII стст. прынеслі крыжаносцы са Святой Зямлі. З ваеннага пункту гледжання цыліндрычныя вежы былі больш эфектыўныя, чым кубічныя: яны мелі менш “сляпых” кропак абстрэлу. Аднак цыліндрычныя вежы аказаліся вельмі нязручнымі для жыцця: круглая форма памяшкання і адсутнасць вуглоў не дазвалялі належным чынам размяшчаць вакол сцен мэблю, што рабіла выкарыстанне жылой плошчы вежы надзвычай праблематычным. Змяншэнне і без таго не вельмі вялікай жылой плошчы, нязвыклая жыллёвая прастора прывялі да адмаўлення ад іх будаўніцтва. Праўда, з эстэтычнага пункту погляду замак з цыліндрычнымі вежамі прыйшоўся даспадобы еўрапейцам, таму ў далейшым вежы ці вежачкі такой формы актыўна выкарыстоўваліся ў якасці дэкаратыўнага элемента, паступова ператварыўшыся ў сімвал замка.

Хочацца звярнуць асаблівую ўвагу на наступную характэрную асаблівасць замка. Яму ўласцівы фіксаваны набор элементаў, архітэктурнае вырашэнне якіх настолькі дасканалае, што яны фактычна зрабілі замак архетыпам. Звычайна ў нашай падсвядомасці слова “замак” выклікае вобраз вежы з зубцамі (бланкаванай вежы). Такое ўвасабленне вобраза было характэрна і для больш ранніх часоў. Так, даволі схематычныя выявы замкаў з зубчастымі вежамі ці

проста вежаў з зубцамі неаднаразова паўтараюцца на гравюрах Францыска Скарыны, на гербах некаторых беларускіх гарадоў. Напрыклад, герб Астрыно змяшчае выяву сярэбранай двухпавярховай вежы з чырвоным канічным дахам, завяршэнне кожнага паверха аформлена зубчастай стужкай; на гербе Барысава – выява мураванай брамы з дзвюма мураванымі вежамі па баках, у вежаў зубчастае завяршэнне і чырвоны канічны дах; на гербе Высокага – сярэбраная мураваная двухпавярховая вежа з зубчастым завяршэннем і канічным дахам; вежы адзначанага тыпу прысутнічаюць на гербах Любчы, Камянца, Магілёва і іншых гарадоў. Аднак важна падкрэсліць, што калі Скарына і стваральнікі гербаў былі сучаснікамі адлюстраваных пабудоў і маглі бачыць такія вежы на ўласныя вочы, дык людзі нашага часу, якія сёння практычна не маюць магчымасці на тэрыторыі Беларусі назіраць падобныя архітэктурныя формы (за выключэннем Камянецкай вежы), усё ж уяўляюць замак менавіта такім чынам. На нашу думку, гэта з’яўляецца спецыфічным праяўленнем генетычнай памяці, архетыпам, закладзеным у нашу падсвядомасць.




Існаванне ў беларускай культуры сімвала зубчастай вежы – з’ява, якая выразна дэманструе непасрэднае ўключэнне гэтай культуры (як часоў Вялікага княства Літоўскага, так і сучаснай) у агульнаеўрапейскі кантэкст. Пацвярджэнне гэтага ўключэння можна адшукаць у падабенстве архітэктурных формаў замкавага дойлідства Вялікага княства Літоўскага і краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Прычым сувязі не абмяжоўваюцца геаграфічна блізкай нямецкай архітэктурай ці прыкладамі архітэктуры краін Скандынавіі. Геаграфія значна шырэйшая. Адзіная агаворка – несінхроннае існаванне тых ці іншых з’яў у часе, а менавіта адставанне вялікакняжацкіх зямель на дватры стагоддзі. Разглядаючы эвалюцыю архітэктурных формаў замкавых пабудоў, асобныя паралелі можна правесці паміж замкамі Вялікага княства Літоўскага і Чэхіі, Францыі, Італіі і нават Брытаніі. Існуе вялікая колькасць варыянтаў еўрапейскай замкавай архітэктуры, якія залежаць ад асаблівасцяў і традыцый канкрэтнай мясцовасці, аднак асноўныя прынцыпы будаўніцтва і набор элементаў з’яўляюцца агульнымі для ўсіх.



Узнікшыя як стратэгічныя абарончыя пункты замкавыя пабудовы з часам эвалюцыянавалі да прадстаўнічых рэзідэнцый. Адбылося гэта таму, што з самага пачатку замак уяўляў сабой элітарнае жыллё – жыллё, прызначанае для арыстакратаў. Нездарма Ж. Дзюбі называе замак “найпершым атрыбутам феадальнай улады” [5, *18*]. Менавіта прадстаўнікі ўлады – самыя ўплывовыя і заможныя людзі ў краіне – маглі дазволіць сабе пастаяннае пражыванне ў замках у адрозненне ад іншых груп насельніцтва, якія неслі службу ці хаваліся там у выпадку варожага нашэсця.

Варта адзначыць, што замак уяўляе сабой сапраўдны культуралагічны феномен. Гэта культурная прастора, аб’ядная не толькі адзінствам тэрыторыі, але агульнасцю матэрыяльнага і духоўнага жыцця. Галоўная яго ідэя – цвярдыня ў прасторы і часе. Валоданне замкам давала чалавеку магчымасць адчуць сваю ўладу не толькі над наваколлем, але і над такімі універсальнымі катэгорыямі, як прастора і час. Магутныя мураваныя пабудовы ўзводзіліся з разлікам не на адно стагоддзе. Сімвалічна, што і матэрыял, які выкарыстоўваўся пры будаўніцтве, нёс у сабе адценне вечнасці: вялізныя камяні, умураваныя ў сцены замкаў, надавалі ім маналітнасць і цэльнасць.



Замак ахоўваў жыхароў і адначасова спрыяў стварэнню і захаванню ў сваіх межах асаблівай атмасферы. Замкнёнасць пабудовы давала ілюзію існавання ўласнага унікальнага мікракосму, адасобленага ад астатняга свету. Умовы жыцця былі такія, што праявы знешняга ўспрымаліся пераважна як негатыўныя. Тым больш каштоўным і значным уяўлялася стварэнне, канструяванне, а потым – існаванне ва ўласнай, індывідуалізаванай прасторы замка.

У гэтым існаванні для арыстакрата адначасова спалучаліся грамадскі абавязак і абарона ўласных інтарэсаў. Трэба адзначыць, што ў самых першых замках задачы абароны пераважалі, аднак ужо ў канцы XIV ст. яны ўраўнаважвалі адна адну. Прыкладам з’яўляецца замак у Троках (сучасны Тракай у Літве). Размешчаны на лініі абароны заходніх межаў Вялікага княства Літоўскага, з выдатнай фартыфікацыяй і цудоўнай гатычнай архітэктурай, ён быў сапраўдным гонарам як гаспадарафеадала, так і ўсёй краіны. Пабудаваны на востраве пасярод возера, магутны цагляны волат уражваў сваёй прыгажосцю і непрыступнасцю.

З эканамічным і палітычным узмацненнем вышэйшага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім у асяроддзі арыстакратыі ўзрасла цікавасць да ўласнай асобы. Лепшым доказам асабістай значнасці і наяўнасці багацця было ўзвядзенне рэзідэнцыі.

Замакрэзідэнцыя стаў неад’емным атрыбутам прадстаўніка вышэйшага саслоўя. Праз яго арыстакрат паказваў сваё месца ў соцыуме, а сама пабудова выступала як індыкатар прэстыжу. У гэтым кантэксце задачай замкарэзідэнцыі была дэманстрацыя таго месца ў грамадстве, якое займаў яго ўладар. “Знешні выгляд мураванага дома ў прасторы ёсць для знатнага вяльможы… сімвал становішча, значэння, рангу яго “дома” ў часе, сімвал яго перажываючага пакаленні рода – а тым самым і яго самога як жывога прадстаўніка дома” [9, *70*].



Са з’яўленнем прыватнаўласніцкага будаўніцтва абарона ўласных інтарэсаў стала вырашальнай пры пабудове замкаў. Пачынаючы з XV ст. у арыстакратычных колах Вялікага княства Літоўскага ўзнікла своеасаблівая мода на ўзвядзенне ў сваіх уладаннях замкаўрэзідэнцый. Пры выбары жылля перад магнатам стаялі дзве задачы: першая – гэта павінен быць замак, другая – такі замак, які б належным чынам адлюстроўваў узровень значнасці ўладара. Апошняе патрабаванне выдатна сфармулявана ў надпісы, размешчаным на прадстаўнічым жыллі Пацаў у Езна: “Wart palac Paca, a Pac palaca” [6, *168*] (“Варты палац Паца, а Пац – палаца”).

У 80х гадах XVIII ст. арыстакратычныя двары ў былым іх значэнні перажывалі крызіс, вынікам якога з’явілася адмаўленне магнатаў ад будаўніцтва вялізных мураваных замкавых комплексаў, утрыманне якіх зрабілася

эканамічна нявыгадным. Больш важную ролю пачалі адыгрываць гарады – гандлёвыя і прамысловыя цэнтры, у якіх стала канцэнтравацца багацце. Прыватнаўласніцкія замкі пачалі прыходзіць у заняпад, калі адышла патрэба ў іх як у магутных сродках рэпрэзентацыі. Так, у свой час разбурэнне агульнадзяржаўных замкаў пачалося тады, калі яны страцілі значэнне стратэгічных абарончых пунктаў.

Новыя замкі не будаваліся, а старыя, пакінутыя гаспадарамі, ператвараліся ў руіны. Пустыя замкі, як агульнадзяржаўныя, так і прыватнаўласніцкія, не імкнуліся аднаўляць ці перабудоўваць. Адны павольна разбураліся самі, а тыя, што ацалелі, выклікалі камерцыйны інтарэс і разглядаліся ў якасці прыдатнага да продажу будаўнічага матэрыялу. Яшчэ ў сярэдзіне XVII ст. з будаўнічага матэрыялу адной з вежаў Навагрудскага замка быў складзены мураваны млынвятрак. У 1802 г. гродзенскі губернатар даў дазвол разабраць рэшткі замкавых вежаў для забрукоўкі вуліц Навагрудка. Вежы Гальшанскага замка ўзарвалі з мэтай продажу цэглы на пабудову карчмы. На цэглу быў разабраны Смалянскі замак і інш.

На вялікі жаль, гістарычныя ўмовы склаліся так, што нават магутныя каменныя сцены не змаглі зберагчы і захаваць тыя шматлікія духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці, якія збіралі і назапашвалі іх былыя ўладары. Беларусы не могуць пахваліцца такой колькасцю адрэстаўраваных старажытных замкаў, як жыхары любой еўрапейскай краіны. Тым не менш мы маем прыгодны для наведвання Мірскі замак, у апошнія гады з’явілася надзея на аднаўленне замкаў у Нясвіжы і Лідзе. Наша грамадская свядомасць паступова звяртаецца да багатага гістарычнага мінулага краіны, і хто ведае, можа, праз колькі дзесяцігоддзяў Беларусь зноў стане “краінай замкаў”.

**Літаратура**

**1. Археалогія Беларусі: У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст./ Пад. рэд. В.М. Ляўко і інш. Мн.: Беларуская навука, 2001. 597 с.**

2. Беларусы: У 8 т. Т. 2. Дойлідства / А.І. Лакотка; Інт мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мн.: Тэхналогія, 1997. 391 с.

3. Генрих Латвийский. Хроника Ливонии / Пер. С.А. Аннинского. 2е изд. М.: Издво АН СССР, 1938. 351 с.

4. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Мн.: Навука і тэхніка, 1987. Т. 1. 303 с.

5. Дюби Ж. Европа в средние века / Пер. с франц. В. Колесникова. Смоленск: Полиграмма, 1994. 316 с.

6. Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье / Репринтное воспроизведение издания 1882 года. Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 1993. 496 с.

7. Ткачоў М.А. Замкі Беларусі. Мн.: Полымя, 1977. 83 с.

8. Шимелевич М. Город Лида и Лидский замок. Вильно, 1905. 142 с.

9. Элиас Н. Придворное общество. Исследования по социологии короля и придворной аристократии / Пер. с нем. А.П. Кухтенкова и др. М.: Языки славянской культуры, 2002. 368 с.